ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
__________ 20 22 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў "Свет захапленняў"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў "Свет захапленняў" (далей – Агляд-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Агляду-конкурсу з'яўляюцца: выяўленне новых сучасных форм работы, вызначэнне шляхоў развіцця аматарскага руху, далучэнне насельніцтва да каштоўнасцей беларускай культуры, прыцягненне да культурна-масавых мерапрыемстваў розных узроставых катэгорый насельніцтва; садзейнічанне стварэнню новых аб'яднанняў, далучэнню насельніцтва да розных форм дасугавай дзейнасці; абагульненню існуючага вопыту, яго прапагандзе і ўкараненню ў практыку клубнай работы.

3. Арганізатарамі Агляду-конкурсу з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".

4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Фестывалю арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўднай Інструкцыяй.

5. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Агляду-конкурсу ажыццяўляецца арганізацыйным камітэтам (далей – аргкамітэт), склад якога зацвярджаецца дадаткова (Дадатак 1).

6. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама аб пераносе даты правядзення Агляду-конкурса (у іншыя тэрміны).

7. Аргкамітэт узгадняе склад журы (Дадатак 2) Агляду-конкурсу, спіс удзельнікаў Агляду-конкурсу, графік правядзення Агляду-конкурсу, узоры ўзнагарод, план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні Агляду-конкурсу;

8. Інфармацыя аб правядзенні Агляду-конкурсу размяшчаецца ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйных сайтах арганізатараў.

9. Агляд-конкурс праводзіцца ў адпаведнасці з планам асноўных мерапрыемстваў упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта на 2023 год.

10. Агляд-конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады.

11. У Аглядзе-конкурсе прымаюць удзел дзіцячыя і дарослыя аматарскія аб'яднанні Гродзенскай вобласці.

12. Агляд-конкурс праводзіцца ў 2 этапы: 1 этап – раённыя адборачныя агляды, неабходна пасля правядзення выслаць на e-mail: info@gromc.by ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" з пазнакай "Свет захапленняў" пацвярджэнне (пратакол, відэа-, фота - матэрыялы і іншае), 2 этап – абласны адборачны агляд (згодна з графікам – Дадатак 3).

13. У рамках 1 этапа раённымі (гарадскімі) установамі культуры клубнага (змешаннага) тыпу праводзяцца адборачныя прагляды адкрытых паседжанняў з мэтай вылучэння лепшых аматарскіх аб'яднанняў для ўдзелу ў 2 этапе Агляду-конкурсу.

14. Для ўдзелу у 2 этапе (абласным аглядзе) аддзелы культуры райгарвыканкамаў прадстаўляюць да 3-х лепшых адкрытых паседжанняў аматарскіх аб'яднанняў – пераможцаў раённых (гарадскіх) тураў.

15. Да ўдзелу ў Аглядзе-конкурсе аматарскім аб'яднанням неабходна падрыхтаваць: паказ адкрытага паседжання, якое найбольш яскрава адлюстроўвае накірунак дзейнасці аб'яднання, адпавядае яго статуту, папку-партфоліо (план работы творчай дзейнасці на 2023 год, сцэнарыі, відэа і фотаматэрыялы пасяджэнняў, копіі водгукаў сродкаў масавай інфармацыі аб творчай дзейнасці калектыву), выставу-прэзентацыю сваёй творчай дзейнасці калектыву.

16. Пры падвядзенні вынікаў Агляду-конкурсу і заахвочванні пераможцаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: ацэнка паказу адкрытага паседжання і ацэнка агульнай дзейнасці аматарскага аб'яднання за апошнія 2 гады, згодна з прадастаўленымі матэрыяламі.

17. Журы 2-га этапу агляду-конкурсу ацэньвае аматарскае аб'яднанне па 10-бальнай сістэме: сярэдні бал выводзіцца па кожнаму члену журы, а затым балы сумуюцца і выводзіцца сярэдні бал па двух крытэрыях, згодна пункта 16 дадзенай Інструкцыі.

18. Журы 2-га этапа Агляду-конкурсу ўзнагароджвае пераможцаў дыпломамі лаўрэата (I, II, III ступені) і прызамі ў дзвюх узроставых катэгорыях (дзіцячая, дарослая) па наступных намінацыях:

1. грамадска-культурны клуб (патрыятычныя, інтэлектуальныя, воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў, аматараў выяўленчага мастацтва, моладзі, жанчын, дзяцей і падлеткаў клубы і інш.);

2. гісторыка-краязнаўчы клуб (клубы аматараў гісторыі, творчых асоб, вывучэння гісторыі роднага краю і інш.);

3. клуб традыцыйнай народнай культуры (клубы аматараў фальклору, майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці і інш.);

4. прыродазнаўчы і фізкультурна-аздараўленчы клубы (клуб загартоўвання, аматараў народнай медыцыны, бегу, аэробікі, вандраванняў і турызму, гісторыі алімпійскага руху і спорту, клуб балельшчыкаў, экалагічны клуб, клуб садаводаў, агароднікаў, кветкаводаў, птушкаводаў, аматараў жывёл, акварыумістаў і інш.);

5. сямейна-бытавы клуб (навукова-тэхнічны клуб, клуб аматараў кулінарыі, беларускай кухні, шыцця, вязання і іншых відаў рукадзелля, клубы маладой сям'і, шматдзетных маці, паляўнічых, рыбаловаў, мота-, вела-, аўтааматараў і інш.).

19. Дыпломамі і спецыяльнымі прызамі ўзнагароджваюцца ўстановы клубнага (змешаннага) тыпу ў наступных намінацыях:

- “За лепшую арганізацыю работы з моладдзю”;
- “За лепшую арганізацыю работы з людзьмі сталога ўзросту”;
- “За лепшую арганізацыю работы з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі”;
- “За крэатыўны падыход”;
- “За лепшы мастацкі ўзровень сцэнарнага матэрыялу”.

20. Журы пакідае за сабой права пры адсутнасці конкурсу ў адной з намінацый альбо катыгорый аб'ядноўваць іх альбо змяняць, уводзіць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду Агляду-конкурсу, падзяляць лаўрэацкія месцы і вызначаць дадатковыя спецыяльныя прызы, не прысуджаць званні лаўрэатам.

21. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

22. Кантактныя тэлефоны аргкамітэта: +375152623799; e-mail: info@gromc.by.

23. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Агляду-конкурсу (у іншыя тэрміны).

24. Фінансаванне Агляду-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

25. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: дыпломы, прызы, спецыяльныя прызы.

26. Для фінансавання Агляду-конкурсу на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

27. Арганізатары Агляду-конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў аматарскіх аб'яднанняў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

# СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

| | | |
|---|---|---|
| Куратчык С.В. | - | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Хільмончык К.В. | - | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пекар А.Ю. | - | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Чапялюк А.А. | - | галоўны рэжысёр ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

## СКЛАД ЖУРЫ
абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

| | | |
|---|---|---|
| Жук-Куніцкая І.Ю. | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня журы; |
| Хільмончык К.В. | - | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, намеснік старшыні журы; |
| Пекар А.Ю. | - | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Чапялюк А.А. | - | галоўны рэжысёр ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці; |
| Гарчычка І.Ю. | - | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

# ГРАФІК
## *правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў” у 2023 годзе*

***Сакавік***

1. Зэльвенскі раён.
2. Слонімскі раён.

***Красавік***

3. Лідскі раён.
4. Іўеўскі раён.
5. Воранаўскі раён.

***Май***

6. Ашмянскі раён.
7. Астравецкі раён.
8. Смаргонскі раён.

***Чэрвень***

9. Карэліцкі раён.
10. Дзятлаўскі раён.
11. Навагрудскі раён.

***Жнівень***

12. Шчучынскі раён.
13. Гродзенскі раён.
14. Мастоўскі раён.

***Верасень***

15. Бераставіцкі раён.
16. г. Гродна.
17. Свіслацкі раён.
18. Ваўкавыскі раён.